# Ад традыцыйнай культуры – да сям'і

***Цягам апошніх стагоддзяў нашае грамадства сур'ёзна змянілася, што не магло не паўплываць на сям'ю. Нярэдка можна пачуць, што сям'я цяпер знаходзіцца ў стане крызісу, калі не ў поўным заняпадзе. Гэта пацвярджае трывожная статыстыка разводаў, нізкая нараджальнасць і інш. Красамоўным сведчаннем з'яўляюцца і настроі ў грамадстве: нават да ідэі стварэння сям'і нашыя сучаснікі, асабліва маладыя людзі, ставяцца даволі неадназначна. І сапраўды, яшчэ якія пяцьдзясят гадоў таму перад большасцю людзей нават не ўзнікала пытання, ствараць сям'ю ці не, гэта было ледзьве не абавязковым этапам жыцця. Сёння ж сям'я ўжо не ўспрымаецца як базавая каштоўнасць, а моладзь часта ўвогуле не бачаць сябе ў ролі мужа, жонкі, бацькі ці маці, знаходзячы ў жыцці іншыя прыярытэты.***

Але ж і ў наш супярэчлівы час шмат хто ў пэўны момант адчувае патрэбу звязаць сваё жыццё з іншым чалавекам. Здараецца такое па-рознаму, а хтосьці прыходзіць да гэтага праз захапленне традыцыйнай культурай. Тут няма нічога дзіўнага, бо ў традыцыйным грамадстве сям'я была неад'емнай часткай жыцця чалавека. Гэта адлюстравана і ў народнай культуры: можна ўзгадаць, што ў спеўным фальклоры вялікі пласт складаюць вясельныя песні. Варта ўспомніць і пра песні-калыханкі, якія сустракаюцца ў культуры бадай што кожнага народа, у тым ліку і ў беларусаў. Вось і здараецца, што, вывучаючы традыцыйную культурную спадчыну, чалавек міжволі праграмуе сябе на стварэнне ўласнай сям'і.





Апрача таго, калі паглыбляешся ў вывучэнне традыцыйнай культуры, хочацца захаваць тое, што пакуль яшчэ не забыта і не згублена. Але ці магчымае нейкае захаванне, калі гэтыя веды ды ўменні няма каму перадаць? На жаль, чалавечае жыццё не вечнае, і, каб традыцыя не перапынілася са смерцю яе носьбітаў, патрэбныя спадкаемцы. Імі і становяцца дзеці.

Не варта таксама забываць, што этнаграфічны рух (прынамсі, у Мінску) гуртуе блізкіх па духу людзей. Таму традыцыйную культуру можна разглядаць як моцны аб'яднальны фактар, бо яна спрыяе знаёмству і збліжэнню людзей, і, само сабою, узнікненню ўзаемных сімпатыяў. Так, на маёй памяці былі два выпадкі, калі пабраліся шлюбам удзельнікі танцавальнай суполкі гурта «Guda».

Важна адзначыць, што традыцыйная культура аб'ядноўвае людзей не толькі таму, што ўваходзіць у сферу іх агульных інтарэсаў, але і таму, што наладжванне сацыяльнага ўзаемадзеяння паміж людзьмі – адна з найважнейшых функцыяў народнай культуры. Да прыкладу, вялікае значэнне ў традыцыйным грамадстве меў такі від мастацтва, як танец, і менавіта на танцах нярэдка знаёміліся хлопцы і дзяўчаты. Думаю, што ў гэтай якасці народны танец не згубіў сваёй актуальнасці і цяпер. Нямала людзей пазнаёмілася дзякуючы танцавальным вечарынам, якія час ад часу ладзяцца разнастайнымі этнасуполкамі. Напрыканцы восені на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пры арганізацыйным удзеле кафедры фізічнага выхавання і спорту такую вечарыну правяла танцавальная суполка гурта «Guda» (кіраўнік Вікторыя Міхно, этнахарэограф Мікола Козенка).

***На заканчэнне скажу, што, калі чалавек пачынае цікавіцца традыцыйнай культурай, змяняецца яго светапогляд, густы, лад жыцця, з'яўляюцца новыя сябры і знаёмыя. Калі ж гэтыя змены звязаныя яшчэ і са стварэннем сям'і, яны перадвызначаюць усё яго далейшае жыццё.***

*Зміцер ГУД,*
*удзельнік фальклорнай суполкі «Guda»*